Источник: "Народная воля" - 2019-03-22

ПРЫРОДА І МЫ

# Перазімавалі!

## *У Мінску будуць выпускаць на волю кажаноў, якія… спалі ў лядоўні*



Летась дзякуючы намаганням Мінскага гарадскога аддзялення грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны», Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства і Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па біярэсурсах быў створаны «Кажанаполіс» – адмысловы цэнтр па ратаванні рукакрылых. У «Кажанаполіс» мінчукі прыносілі знойдзеных узімку кажаноў. Справа ў тым, што кажаны ў халодны сезон засынаюць, рытм сэрца ў іх запавольваецца, а тэмпература паніжаецца. Калі іх патурбуюць у гэты час, то да вясны яны, хутчэй за ўсё, не дажывуць. У «Кажанаполісе» жывёл месцілі ў лядоўні, і такім чынам там перазімавала больш за тры дзясяткі кажаноў.

Усіх, хто хоча на свае вочы пабачыць гэтых істот, валанцёры «Кажанаполіса» запрашаюць у суботу 23 сакавіка ў сталічны парк Чалюскінцаў. Сустрэча прызначана ля галоўнага ўваходу ў парк у 18.30.

"Народная воля". Перазімавалі!